Sputnik Беларусь

23.03.2018

# Кнігазнаўцы з Латвіі і Польшчы прыедуць на Міжнародныя чытанні ў Беларусь



Уладальнік самай вялікай калекцыі буквароў у свеце возьме ўдзел у мерапрыемстве.

Вучоныя-кнігазнаўцы з Польшчы, Літвы і Латвіі выступяць на XIV Міжнародных кнігазнаўчых чытаннях, паведамілі ў прэс-службе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Чакаецца, што з нагоды мерапрыемства ў беларускую сталіцу прыедзе уладальнік самай вялікай калекцыі буквароў у свеце, калекцыянер з Латвіі Юрыс Цыбульс. З дакладамі па гісторыі кніжнай культуры таксама выступяць доктар гуманітарных навук, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута літоўскай мовы (Літва) Надзея Марозава, старшы бібліятэкар Бібліятэкі Вільнюскага ўніверсітэта (Літва) Іна Кажура, доктар гістарычных навук, навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Польскай акадэміі навук (Польшча) Лілія Коўкель.

XIV Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні пройдуць у Мінску 26-27 красавіка пры падтрымцы праекта Еўрапейскага саюза MOST - Праграма мабільнасці для мэтанакіраваных міжасобасных кантактаў.